Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
____________________Ю.П.Бондар
“___”______________2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_______/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КАМПАЗІЦЫЯ Ў ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНЫМ МАСТАЦТВЕ

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-04*
*Народная творчасць (народныя рамёствы)*

Мінск 2011

**Складальнік**

*Н.У.Стэльмашонак,* выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*Г.В.Лойка,* загадчык кафедры мастацкай і педагагічнай адукацыі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка”, дацэнт;

*Р.Ф.Шаура,* загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, доктар мастацтвазнаўства, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 4 ад 24.12.2009 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 5 ад 16.03.2010 г.)

Адказны за рэдакцыю *В.В.Каташвілі*

Адказны за выпуск *Н.У.Стэльмашонак*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Кампазіцыя ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (ДПМ)” з’яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў па напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-04 “Народная творчасць (народныя рамёствы)”.

“Кампазіцыя ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве” дае магчымасць набыць шэраг спецыяльных ведаў, якія з’яўляюцца неабходнымі, аб’ядноўваюць многія мастацкія дысцыпліны (такія, як малюнак, жывапіс, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, канструяванне, колеразнаўства, дызайн) і дапамагаюць практычнаму авалоданню імі.

Асноўным прынцыпам тэхналогіі навучання кампазіцыі з’яўляецца паслядоўнасць засваення ведаў: ад тэарэтычнага разбору і асэнсавання пастаўленай задачы – праз паслядоўнае яе вырашэнне метадам эскізных пошукаў – да лагічнага завяршэння ў выглядзе чыставой падачы графічнай і аб’ёмна-пластычнай частак праекта.

Асноўны *змест* дысцыпліны складаюць тэмы, якія паступова знаёмяць студэнтаў з метадамі стварэння розных відаў кампазіцыі: мастацкай арганізацыяй плоскасці, аб’ёму, прасторы, а таксама выкарыстаннем і ўзаемадзеяннем розных пластычных і колеравых сродкаў. Акрамя таго, студэнты вывучаюць асаблівасці кампазіцыі, каларыту і стылізацыі ў народным мастацтве. Усе вучэбныя, творчыя і курсавыя праекты падчас навучання выконваюцца ў розных графічных тэхніках і з выкарыстаннем разнастайных тэхнічных сродкаў; на старэйшых курсах вялікая ўвага надаецца тэхніцы выканання праектаў, стылёваму адзінству, вобразнай і колеравай выразнасці кампазіцыі. Стварэнне цэласнай сістэмы ансамбля прадметнага асяроддзя з’яўляецца адным з важных напрамкаў творчай дзейнасці мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Асноўная *мэта* дысцыпліны “Кампазіцыя ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве” – развіццё мастацкіх здольнасцей студэнтаў, эстэтычнага светапогляду сучаснага мастака на аснове асэнсавання, ужывання і трансфармавання нацыянальных традыцый у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, а таксама фарміраванне ў будучых спецыялістаў навукова абгрун-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таваных ведаў аб стварэнні франтальнай, аб'ёмнай і аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі ў ДПМ.

*Задачамі* курса з'яўляюцца засваенне навуковых звестак з гісторыі, тэорыі і методыкі прадмета, прафесійнае валоданне на практыцы асноўнымі сродкамі кампазіцыі, кампазіцыйнымі пабудовамі, пластыкай для ўвасаблення мастацкай ідэі, living рознымі графічнымі тэхнікамі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя тыпы кампазіцыі ў гістарычных стылях мастацтва Сярэднявечча, Адраджэння, барока, класіцызму;

– віды кампазіцыйных пабудоў у пластычных мастацтвах;

– кампаненты кампазіцыйнай пабудовы;

– спецыфіку кампазіцыйных распрацовак у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве з улікам матэрыялу і тэхнікі стварэння твора;

*умець:*

– суадносіць фармальныя элементы кампазіцыі адпаведна традыцыйным акадэмічным патрабаванням;

– ствараць арыгінальныя распрацоўкі, заснаваныя на свабодных кампазіцыйных прыёмах, у адпаведнасці з пастаўленымі задачамі;

– вылучаць фармальны цэнтр і сілавыя лініі кампазіцыі;

– фарміраваць цэласнасць кампазіцыі ў творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва праз суладдзе фармальных і ідэйна-сэнсавых кампанентаў.

Асноўнымі *метадамі* навучання кампазіцыі з'яўляюцца:

– эмацыянальна-рацыянальны аналіз твораў сусветнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

– паэтапнасць выканання плоскасна-графічных і аб'ёмных варыянтаў вырашэння пастаўленых задач;

– выкарыстанне індывідуальных і калектыўных формаў працы, абмеркаванне вынікаў аўдыторных і самастойных заданняў.

Па дысцыпліне "Кампазіцыя ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве" вучэбным планам усяго прадугледжана 490 гадзін, з якіх 218 – аўдыторныя (лекцыі – 20, лабараторныя заняткі – 198). Формы выніковага кантролю – залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | лаб. заняткі |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| *Тэма 1.* Выразныя сродкі кампазіцыі і метады іх выкарыстання ў мастацкай творчасці | 62 | 2 | 60 |
| *Тэма 2.* Стылізацыя формы як прыём стварэння кампазіцыі | 54 | 4 | 50 |
| *Тэма 3.* Кампазіцыйнае рашэнне вобразна-стылёвых асаблівасцей твора | 30 | 2 | 28 |
| *Тэма 4.* Кампазіцыйныя прыёмы стварэння ансамбля | 32 | 2 | 30 |
| *Тэма 5.* Твор ДПМ як мастацкі кампанент інтэр’ера | 38 | 8 | 30 |
| **Усяго…** | **218** | **20** | **198** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Месца дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыяліста. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Структура дысцыпліны, формы кантролю.

Кампазіцыя як аснова стварэння мастацкага вобраза, сродак вырашэння мастацкай ідэі; мова мастацкага твора. Развіццё вобразнага кампазіцыйнага мыслення. Кампазіцыя фармальная, дэкаратыўная і станкавая (агульныя рысы і адрозненні, часткі і элементы кампазіцыі, кампазіцыйныя схемы). Асноўныя законы кампазіцыі.

*Тэма 1. Выразныя сродкі кампазіцыі і метады іх выкарыстання ў мастацкай творчасці*

Кропка, пляма, лінія, колер, фактура як сродкі мастацкай выразнасці. Элементы кампазіцыі. Сілавыя лініі кампазіцыі. Візуалізацыя мастацкай ідэі ў пластычны вобраз. Пластыка. Вобразная выразнасць. Стварэнне пар, пабудаваных на кантрасце. Рытмічнасць. Тон і колер. Маштаб, прапорцыі, форма. Пабудова модульных сістэм. Арнамент: класіфікацыйныя прыкметы, прызначэнне, змест. Сувязь арнаменту з рознымі відамі мастацтва. Выразныя сродкі арнаментальнай кампазіцыі. Кампазіцыя дэкаратыўнага пано.

***Лабараторныя заняткі***

*Заданне 1.1*

Распрацоўка фармальных кампазіцый, пабудаваных на кантрасце: сіметрыя-асіметрыя, дынаміка-статыка, нюанс-кантраст. Практыкаванні выконваюцца на плоскасці (папера фармат А4, туш, гуаш, ч/б) і ў аб'ёме (папера, вышыня – да 20 см) з элементаў геаметрычнага характару.

*Задача.* На аснове прапанаваных заданняў засвоіць прынцыпы кампазіцыйных пабудоў. Умець суадносіць фармальныя элементы кампазіцыі: пляму і лінію, святло і цень, прапорцыі, масы, фактуры. Праявіць уменне выкарыстання графічных сродкаў. Разумець метады стварэння цэльнай, устой-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лівай, ураўнаважанай па масе аб'ёмнай формы. Паказаць валоданне тэхнічнымі сродкамі працы з паперай.

*Заданне 1.2*

Пабудова геаметрычнага арнаменту. Заданне выконваецца ў графічным (А2, туш, гуаш, акварэль, ч/б, магчыма ўжыванне градацый шэрага колеру) і аб'ёмным (20х5, пластылін, гліна; магчыма адліўка ў гіпсе) варыянтах.

*Задача.* Засвоіць метады кампазіцыйнай пабудовы арнаменту. Ведаць і ўмець прымяняць на практыцы розныя віды сіметрыі і рытму. Стварыць рэльеф з пластычна ўзаемазвязанымі, прапарцыянальна і маштабна вытрыманымі рытмічнымі чаргаваннямі вышынь і глыбінь.

*Заданне 1.3*

Распрацоўка плоскаснага і аб'ёмнага геаметрычных модульных элементаў. Састаўленне на аснове распрацаваных элементаў розных відаў кампазіцыйных пабудоў. Заданне выконваецца ў графічным (А2, туш, гуаш, ч/б, магчыма ўжыванне шэрага колеру) і аб'ёмным (5х5х5, папера, кардон альбо пластылін, гліна, гіпс; агульная вышыня – да 20 см) варыянтах.

*Задача.* Авалодаць сродкамі і прыёмамі двухмернай кампазіцыйнай пабудовы на аснове метрычнай адзінкі. Распрацаваць аб'ёмны элемент з улікам магчымасцей камбінавання і стварэння новых, якасна іншых структур. Разумець сродкі аб'ёмнага модульнага формаўтварэння. Засвоіць прынцып камбінаторнай арганізацыі аб'ёмна-прасторавага твора на аснове аб'ёмнага модульнага элемента.

*Заданне 1.4*

Дэкаратыўная кампазіцыя з выкарыстаннем элементаў невыяўленчага характару. Заданне выконваецца ў графічным (А1, туш, гуаш, акварэль, змешаная тэхніка, ч/б, магчыма ўжыванне градацый шэрага, а таксама аднаго ўмоўнага колеру) і аб'ёмным (рэльеф 20х30, папера альбо пластылін, гліна, гіпс) варыянтах.

*Задача.* Стварыць цэльную і выразную па стылістыцы і пластыцы, ураўнаважаную па масе і плямах, эстэтычна вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трыманую монакампазіцыю з ярка выражаным кампазіцыйным цэнтрам і супадпарадкаваннем элементаў.

Прадэманстраваць адзінства фармальных і ідэйна-сэнсавых кампанентаў кампазіцыі, здольнасць данясення вобразна-мастацкага зместу кампазіцыі праз абстрактную форму. Вытрымаць у рэльефнай кампазіцыі гарманічныя маштабныя і прапарцыянальныя суадносіны масы, элементаў, фактур, святлаценяў, вышыні і глыбіні. Выразна вылучыць кампазіцыйны цэнтр, супадпарадкаваць элементы кампазіцыі. Паказаць тэхнічнае валоданне прыёмамі працы з абраным для выканання рэльефа матэрыялам.

*Тэма 2. Стылізацыя формы як прыём стварэння кампазіцыі*

Паняцце стылізацыі і яе роля ў пабудове дэкаратыўнай кампазіцыі. Мастацкі стыль як адзінства мастацкіх сродкаў і адзіная ідэйная праграма. Еднасць формы і зместу. Асноўныя задачы стылізацыі. Ступені стылізацыі. Стылізацыя і камбінаванне. Асаблівасці выявы чалавека у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Выкарыстанне стылізацыі ў дэкаратыўнай кампазіцыі.

***Лабараторныя заняткі***

*Заданне 2.1*

Стылізацыя прыродных формаў (флора). Заданне выконваецца ў графічным варыянце (А1, туш, гуаш, акварэль).

*Задача.* Паказаць разуменне этапаў працы над стылізацыяй. Знайсці арыгінальна-вобразныя рашэнні на кожнай ступені стылізацыі. Распрацаваць варыянты дэкаратыўнага стылізаванага расліннага элемента для розных матэрыялаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Прадэманстраваць здольнасць падпарадкавання натурнага матэрыялу матэрыялам ДПМ.

*Заданне 2.2*

Праект двухмернага вырабу дэкаратыўна-прыкладнога характару з раслінным арнаментам, створаным з выкарыстаннем распрацаванага ў папярэднім заданні элемента. Заданне выконваецца ў колеры ў графічным варыянце (А1, гуаш, ак-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

варэль, тэхнічны чарцёж – туш) з улікам магчымасці выканання ў матэрыяле.

*Задача.* Прадэманстраваць здольнасць ўпарадкавання пластычных, танальных і сэнсавых сувязей метрычных элементаў паміж сабой пры стварэнні арнаментальнай кампазіцыі, а таксама – адпаведнасць формы, зместу і месцазнаходжання арнаменту уласна форме і функцыі вырабу.

*Заданне 2.3*

Стылізацыя прадстаўнікоў фаўны. Заданне выконваецца ў графічным варыянце (А1, туш, гуаш, акварэль).

*Задача.* Паказаць разуменне этапаў працы над стылізацыяй. Знайсці арыгінальна-вобразныя рашэнні на кожнай ступені стылізацыі. Распрацаваць варыянты дэкаратыўнага стылізаванага анімалістычнага элемента для розных матэрыялаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Прадэманстраваць здольнасць падпарадкавання натурнага матэрыялу матэрыялам ДПМ.

*Заданне 2.4*

Праект анімалістычнай скульптуры. Заданне выконваецца ў графічным (чарцёж: А2, туш) і аб’ёмным (да 30 см, папера ці мяккі матэрыял – пластылін, гліна) варыянтах.

*Задача.* Стварыць граматны тэхнічны чарцёж вырабу з улікам матэрыялу ДПМ, указаннем памераў і неабходных сячэнняў. У аб’ёмнай пластыцы – прадэманстраваць выразнае вобразна-пластычнае рашэнне, цэльнасць, ураўнаважанасць і адзінства кампазіцыі шляхам вылучэння кампазіцыйнага цэнтра і дасягнення гарманічнага спалучэння якасцей формы (геаметрычнага выгляду, прапорцый, маштабу, супадпарадкавання элементаў, гарманічных суадносін фактуры, тэкстуры, колеру, святлаценю).

*Заданне 2.5*

Стылізацыя фігуры чалавека. Выкарыстанне антрапаморфнай выявы ў дэкаратыўнай кампазіцыі. Заданне выконваецца ў графічным (А2, туш, гуаш, акварэль) і аб’ёмным (двух- ці трохмерны аб’ект: да 20 см, папера ці мяккі матэрыял) варыянтах.

*Задача.* Паказаць разуменне асноў стылізацыі фігуры чалавека, вылучыць этапы пераўтварэння рэалістычнага вобраза ў дэкаратыўны, здольнасць да мастацкага абагульнення, гра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матнае выкарыстанне разнастайных кампазіцыйных сродкаў арганізацыі абранай формы і віду вырабу. Стварыць ідэйна асэнсаваную кампазіцыю, эмацыянальна і пластычна выразны вобраз.

*Тэма 3. Кампазіцыйнае рашэнне вобразна-стылёвых асаблівасцей твора*

Прынцыпы фармаўтварэння ў ДПМ. Функцыя, марфалогія, тэхналогія і вобраз прадмета. Залежнасць заканамернасцей і прынцыпаў кампазіцыі ад мастацкага вобраза. Улік фармаўтваральных фактараў. Патрабаванні тэхнічнай эстэтыкі, стандартаў і якасці вырабаў. Сувязь "чалавек – прадмет". Эрганоміка. Разумовая, крытыка-ацэначная, нарміровачная дзейнасць мастака ў працэсе мастацкага праектавання. Утылітарныя і сувенірныя вырабы.

***Лабараторныя заняткі***

*Заданне 3.1*

Праектаванне вырабу ДПМ з утылітарным прызначэннем. Заданне выконваецца ў графічным варыянце (А2 – 2 шт.: № 1 праект вырабу ў колеры – гуаш, акварэль, змешаная тэхніка; № 2 тэхнічныя чарцяжы і суправаджальныя звесткі – туш, акварэль.

*Задача.* Арганізаваць аб'ём праз лагічнае вырашэнне ўсіх бакоў формы, якія падкрэсліваюць сутнасць канструкцыі. Паказаць у праекце разуменне ўзаемасувязей функцыі, марфалогіі, тэхналогіі і вобраза вырабу ДПМ. Граматна прымяніць розныя кампазіцыйныя сродкі. Прадэманстраваць разуменне адзінства формы і дэкору. Разумець спецыфіку праектавання ўнікальнага аўтарскага вырабу і вырабу, прызначанага для серыйнай вытворчасці.

*Тэма 4. Кампазіцыйныя прыёмы стварэння ансамбля*

Віды кампаноўкі частак у структуру. Лагічнае асэнсаванне сувязей элементаў пры пабудове груп у сюжэтных рашэннях. Спосабы пошуку новай прасторавай структуры. "Канструкцыйная ідэя" твора. Сувымярэнне частак з дапамогай асноў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных кампазіцыйных сродкаў. Ансамблевыя рашэнні (гарнітур, камплект, набор, сервіз). Арганізацыя элементаў ансамбля ў прасторы. Прынцыпы і метады пабудовы кампазіцыі ансамбля. Узаемаўзбагачэнне і выразнасць частак, колеравае і эмацыянальна-вобразнае рашэнне мастацкага ансамбля.

### *Лабараторныя заняткі*

*Заданне 4.1*

Распрацоўка камплекта ўжытковых прадметаў ДПМ. Заданне выконваецца ў графічным варыянце (А1 – 2 шт.: № 1 праект ў колеры – гуаш, акварэль, змешаная тэхніка; № 2 тэхнічныя чарцяжы і суправаджальныя звесткі – туш, акварэль).

*Задача.* Паказаць веданне прынцыпаў і метадаў пабудовы кампазіцыі ансамбля, сувымернасць частак твора, эрганамічную адпаведнасць патрабаванням вытворчых стандартаў. Прадэманстраваць адпаведнасць ідэі вобразна-пластычнаму рашэнню твора.

### *Тэма 5. Твор ДПМ як мастацкі кампанент інтэр'ера*

Сутнасць архітэктуры. Экстэр'ер і інтэр'ер. Фарміраванне і адметныя рысы гістарычных архітэктурных стыляў. Асаблівасці, месца і роля твора ДПМ у гістарычным інтэр'еры.

Інтэр'ер як сістэма. Крытэрыі мэтазгоднасці: эрганоміка, функцыянальнасць, архітэктоніка, метрарытмічнасць, колер, святло. Комплекснае рашэнне інтэр'ера. Эстэтычнае асяроддзе.

Твор ДПМ у сучасным інтэр'еры: функцыянальнасць і суіснаванне. Грамадскі і жылы інтэр'ер. Месца твора ДПМ у інтэр'еры: віды і матэрыялы, функцыі і прыёмы ўключэння ў асяроддзе.

Мастацка-вобразнае рашэнне глыбінна-прасторавай кампазіцыі: мастацкая ідэя, гарманізацыя вобразнай структуры. Прапорцыі і маштаб. Колеравае рашэнне ансамбля. Псіхафізіялагічнае і эстэтычнае ўздзеянне колеру на асобу. Крытэрыі аптымальнасці колеравага асяроддзя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Лабараторныя заняткі*

*Заданне 5.1*

Распрацоўка аб’ёмна-прасторавай кампазіцыі ў інтэр’еры. Заданне выконваецца ў графічным варыянце (А1 – 2 шт.: № 1 аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя ў колеры – гуаш, акварэль, змешаная тэхніка; № 2 выява часткі ансамбля інтэр’ера, чарцяжы і суправаджальныя звесткі – туш, акварэль).

*Задача.* Паказаць веданне прынцыпаў і метадаў пабудовы кампазіцыі ансамбля ў інтэр’еры. Прадэманстраваць граматнае выкарыстанне ў праекце розных кампазіцыйных сувязей для стварэння адзінага ансамбля. Улічыць функцыянальныя і эрганамічныя патрабаванні. Прадэманстраваць адпаведнасць ідэі вобразна-пластычнаму рашэнню ансамбля і месцу твора ў ім. Паказаць валоданне асновамі перспектыўнай пабудовы інтэр’ера і тэхнічнымі сродкамі графічнай падачы ідэі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*Беляев, М.В.* Основы композиции: учеб.-метод. пособие / М.В.Беляев. – Мінск: БГПУ им. М.Танка, 2002. – 80 с.

*Голубева, О.Л.* Основы композиции / О.Л.Голубева. – М.: Сварог и К, 2008. – 144 с.

*Даглдиян, К.Т.* Декоративная композиция: учеб. пособие / К.Т.Даглдиян. – Ростов н/Д: Феникс, 2010. – 320 с.

*Кацар, М.С.* Беларускі арнамент / М.С.Кацар. – Мінск: Бел. энцыкл., 1996. – 208 с.

*Пономарева, Е.С.* Интерьер и оборудование гражданских зданий / Е.С.Пономарева. – Минск: Выш. шк., 1976. – 224 с.

*Сахута, Я.* Народнае мастацтва Беларусі / Я.Сахута. – Мінск: Бел. энцыкл., 1997. – 288 с.

*Сенько, Д.С.* Основы композиции и цветоведения в художественно-оформительском искусстве / Д.С.Сенько. – Минск: Беларусь, 2007. – 184 с.

*Степанов, Н.Н.* Цвет в интерьере / Н.Н.Степанов. – Киев: Вища школа, 1985. – 96 с.

*Чернышов, О.В.* Формальная композиция / О.В.Чернышов. – Минск: Харвест, 1999. – 232 с.

*Дадатковая*

*Некрасова, М.А.* Народное искусство как часть культуры / М.А.Некрасова. – М.: Изобр. искусство, 1983. – 344 с.

*Фадзеева, В.Я.* Беларускі ручнік / В.Я.Фадзеева. – Мінск: Полымя, 1994. –328 с.

*Шорохов, Е.В.* Композиция: учеб. пособие / Е.В. Шорохов, Н.Козлов. – М.: Просвещение, 1978. – 235 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**КАМПАЗІЦЫЯ**
**Ў ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНЫМ МАСТАЦТВЕ**

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-04*
*Народная творчасць (народныя рамёствы)*

Рэдактар В.В.Каташвілі
Тэхнічны рэдактар А.У.Гіцкая

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,88. Ул.-выд. арк. 0,45.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ